УДК 811.161.3’367.625

# Механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова

**Чайка Н.У.**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Мінск*

*Актуальнасць даследавання абумоўлена неабходнасцю ўстанавіць спецыфіку спосабаў эксплікацыі прэдыкатыўных значэнняў у эліптычных сказах і ўмовы іх функцыянавання.*

*Мэта даследавання – выявіць і структураваць мадэлі рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыял даследавання – беларуская мастацкая проза XX–XXI стагоддзяў. Выкарыстоўваліся апісальны метад, кампанентны аналіз, трансфармацыйны метад, сінтаксічнае мадэляванне, дыстрыбутыўны і статыстычны метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Кампенсаторная функцыя прэдыкатыўных частак поліпрэдыкатыўных і ўскладненых сінтаксічных адзінак і кампанентаў у структуры звышфразавага адзінства рэгулюецца структурна-сэнсавымі моўнымі механізмамі. Структураванне сінтаксічнага аб’екта ў семантычныя мадэлі і структурныя схемы заснавана на фармальных моўных механізмах. Кампенсаторная функцыя кампанентаў на аснове семантычнай тоеснасці і ўзгаднення рэгулюецца сэнсавымі механізмамі.*

***Заключэнне.*** *Моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю частак у структуры поліпрэдыкатыўных сінтаксічных адзінак з эліпсісам дзеяслова: экспліцытна-паратаксічнага, імпліцытна-паратаксічнага, эксплiцытна-гіпатаксічнага, імпліцытна-гіпатаксічнага, камбінаванага відаў; замяшчэнне эліпсаванага выказніка функцыянальна тоесным кампанентам ў канструкцыях наступных семантычных тыпаў: дынамічна-лакатыўнага, экзістэнцыяльна-лакатыўнага, лакатыўна-пацыентыўнага, акцыянальна-безаб’ектнага, акцыянальна-дэлібератыўнага, акцыянальна-аб’ектнага пераўтваральнага і інш.; структураванне семантычных тыпаў эліптычных канструкцый у адпаведныя мадэлі і схемы.*

***Ключавыя словы:*** *эліпсіс, кампенсаторная прыкмета, параметры тыпалогіі, інварыянтныя мадэлі, структурныя, семантычныя мадэлі, тып прэдыката, тэмпаральнасць, мадальнасць, персанальнасць, парадыгма структурна-сінтаксічных мадыфікацый, канструкцыі з імпліцытнай семантыкай, сінтаксічнай рэдукцыяй, кампрэсіяй, парцэляцыя.*

*(Ученые записки. – 2023. – Том 38. – С. 135–139)*

# Mechanisms for Regulating the Compensatory Function of Components in Constructions with an Ellipsis of the Verb

**Chaika N.V.**
*Education Establishment “Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University”, Minsk*

*The relevance of the study is due to the need to establish the specifics of the ways of explication of predicative meanings in elliptic sentences and the conditions of their functioning.*

*The purpose of the research is to identify and structure models for regulating the compensatory function of components in constructions with an ellipsis of the verb.*

***Material and methods.*** *The material of the study was the Belarusian fiction of the 20th-21st centuries. The descriptive method, component analysis, transformational method, syntactic modeling, distributive method and statistical method were used.*

***Findings and their discussion.*** *The compensatory function of the predicative parts of the polypredicative and complicated syntactic units and components in the structure of the supra-phrasal unity is regulated by structural and semantic linguistic mechanisms. Structuring of a syntactic object into semantic models and structural schemes is based on formal language mechanisms. The compensatory function of components based on semantic identity and agreement is regulated by semantic mechanisms.*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: natusia12@tut.by*** *– Н.У. Чайка*

***Conclusion.*** *Linguistic mechanisms regulate the compensatory function of parts in the structure of polypredicative syntactic units with the ellipsis of the verb: explicit-paratoxic, implicit-paratoxic, explicit-hypotoxic, implicit-hypotoxic, combined types; replacement of an elliptic predicate with a functionally identical component in constructions of the following semantic types: dynamic-locative, existential-locative, locative-patient, promotional-objectless, promotional-deliberative, promotional-object transformative etc.; structuring of semantic types of elliptical structures in the corresponding models and schemes.*
***Key words:*** *ellipsis, compensatory feature, typology parameters, invariant models, structural and semantic models, predicate type, temporality, modality, personality, paradigm of structural and syntactic modifications, constructions with implicit semantics, syntactic reduction and compression, parcellation.*

*(Scientific notes. – 2023. – Vol. 38. – P. 135–139)*

Развіццё сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы на сучасным этапе выклікала значнае пашырэнне адзінак дынамічнага сінтаксісу: канструкцый з эліпсісам дзеяслова, парцэляваных канструкцый, канструкцый з імпліцытнай семантыкай, з сінтаксічнай рэдукцыяй і кампрэсіяй, вытворных канструкцый, падпарадкаваных універсальным філасофскім законам актуалізацыі неабходнай інфармацыі. Антрапацэнтрычны характар сучасных моўных працэсаў выклікаў тэндэнцыю да ўдасканалення механізмаў рэгулявання моўнай сістэмы, што паўплывала на карэляцыю паміж развіццём мыслення і матэрыяльнымі сродкамі яго выражэння. У сувязі з гэтым тыпалагічнае апісанне адзінак дынамічнага сінтаксісу з выяўленнем спецыфікі моўных з’яў і заканамернасцей іх функцыянавання стала адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннага і замежнага мовазнаўства. Гэту працу ў поўным аб’ёме магчыма ажыццявіць толькі з дапамогай вытлумачальнага патэнцыялу тыпалагічнай характарыстыкі аб’екта і метадалогіі, якая выяўляе сутнасць і прыроду сінтаксічнай з’явы.

Развіццё сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы тлумачыцца агульнымі тэндэнцыямі сучаснасці – эканоміі моўных сродкаў, дыстынктнасцю выказвання, тэндэнцыяй да аналітызму і патрэбай інфармацыйнага акцэнтавання. Названыя фактары абумоўліваюць шырокае функцыянаванне структурна-сінтаксічных мадыфікацый – канструкцый няпоўных, эліптычных, вытворных, рэдукаваных, парцэляваных і сегментаваных, а таксама з імпліцытнай семантыкай. Сінтаксічная сістэма беларускай мовы імкліва мяняе аблічча – канструкцыі набываюць структурную фрагментарнасць, сінтаксічныя сувязі і адносіны нейтралізуюцца, канструкцыі скарачаюцца да памеру рэплікі, прэдыкатыўнасць выражаецца сродкамі кантэксту або імпліцытна, часцей назіраецца «другаснае прэдыцыраванне» ў сказах розных структурных тыпаў. Таму падобныя з’явы выклікаюць цікавасць даследчыкаў на сучасным этапе.

Механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі вывучаліся прадстаўнікамі розных школ і напрамкаў – структурнай лінгвістыкі (Дж. Арма, М. Вішнеўскі, А.В. Грудзева, А.М. Мухін, Т.Д. Шабанава) [1–5], семантычнага напрамку ў мовазнаўстве (К. Карлсан, П.А. Лекант, Г.А. Золатава) [6–8], функцыянальнага напрамку даследавання (Т.А. Коласава, Я.У. Лісочанка, С.С. Дзікарова, Б. Хаўнспергер, А. Унішэўска) [9–12]. Даследчыкі рабілі акцэнт на з’явах сінтаксічнай непаўнаты, вытлумачальным патэнцыялам пры гэтым служыла тыпалагічная характарыстыка аб’екта лінгвістыкі з улікам адпаведных параметраў упарадкавання. У працах таксама ўкаранілася пытанне дыстынктнасці выказвання, аб’ектам вывучэння пры гэтым выступалі парцэляцыя, сегментацыя.

Нягледзячы на значную колькасць прац па актуальных працэсах у сінтаксічных сістэмах розных моў, на беларускамоўным матэрыяле падобныя даследаванні не праводзіліся. Актуальнасць такога аналізу абумоўлена неабходнасцю выявіць асноўныя механізмы функцыянавання структурна-сінтаксічных мадыфікацый.

Мэта даследавання – выявіць механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова.

**Матэрыял і метады.** Сістэма моўных механізмаў адлюстроўвае законы і заканамернасці, што рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Кампенсацыя эліпсіса ажыццяўляецца з дапамогай моўных сродкаў розных узроўняў – сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага, фанетычнага, таксама можа быць абумоўлена логіка-семантычнымі фактарамі (імпліцытная семантыка). Клас моўных механізмаў, што рэгулююць функцыянаванне эліптычных канструкцый, паводле якаснага і колькаснага складу не мае аналагаў у сінтаксічнай сістэме сучаснай беларускай літаратурнай мовы (мал.).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** ***Структурна-сэнсавыя моўныя механізмы*** рэгулююць структурна-сістэмную абумоўленасць функцыянавання канструкцый з эліпсісам дзеяслова.

Структурныя фактары праяўляюцца ў кампенсацыі сэнсу сказа шляхам разгортвання сінтаксічных пазіцый, а таксама ва ўзаемадзеянні кампанентаў у структуры звышфразавага адзінства. Сэнсавыя фактары рэалізуюцца ў сэнсавай спалучальнасці або ва ўзгадненні структурных кампанентаў (а гэта залежыць ад характару сінтаксічнай сувязі). Выражаны характар механізм структурна-сэнсавага рэгулявання набывае ў канструкцыях з поліфункцыянальным характарам залежных словаформ, дзе адзіным сродкам маркіроўкі сэнсу выступае структурны кампанент – аднародныя выказнікі, адасобленыя члены, параўнальны зварот, устаўная канструкцыя і інш.




Мал. **Механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў**

Сутнасць структурна-сэнсавага рэгулявання заключаецца ў вызначэнні кола лексем, што могуць узгадняцца з залежнай словаформай і замяшчаць сінтаксічную пазіцыю выказніка. Сэнсавае ўзгадненне (у адрозненне ад сэнсавай спалучальнасці, якая рэалізуецца пераважна на базе падпарадкавальнай сувязі) структурна абумоўлена і можа ажыццяўляцца на аснове паратаксічнай сінтаксічнай сувязі: *Міхась доўга – на раку за вёскай і адарваца не можа* (Б. Мікуліч), паўпрэдыкатыўнай: *Над вёскай белыя воблачкі, час ад часу спыняючыся* (Я. Брыль), далучальнай: *Трэба было пахаваць паклажу. І Лявон – у хату да дзеда Саўкі, і не што-небудзь, а ваенную маёмасць* (Г. Далідовіч), інтрадуктыўнай: *Іван Сідаравіч пра ўсё – з інтарэсам (а слухаць ён любіў)* («Белая Русь»). Наяўнасць скрытай прэдыкатыўнасці ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова дазваляе на аснове параўнальнай сувязі «ўзгадніць» магчымае лексічнае напаўненне эліпсаванага дзеяслова: *Над намі воблакі, нібы імклівыя белыя лебедзі.* Падпарадкоўваецца структурна-сэнсавым механізмам і ўзаемадзеянне кампанентаў у структуры звышфразавага адзінства на аснове логіка-семантычных або семантыка-сінтаксічных адносін: *Яшчэ ў мяне старэйшая сястра. Без яе цяжка было б пражыць* (Г. Далідовіч).

Фунцыянаванне складаных канструкцый з эліпсісам дзеяслова абумоўлена падключэннем яшчэ і сінтаксічных адносін, на аснове якіх ажыццяўляецца

семантычнае ўзгадненне або спалучальнасць. Абавязковай умовай рэалізацыі сэнсавага ўзгаднення выступае сінтаксічны паралелізм, які назіраецца ў складаных сказах розных відаў з адносінамі аднaчасовасці, паслядоўнасці, неадпаведнасці і інш.: *Жыта – у Хведарава гумно, авёс і пшаніцу – у Грыбковае, грэчку і проса – да Алёшы Губатага* (І. Мележ) або ў канструкцыях з канстантнай маркіроўкай семантыкі: *За невялічкай паласой лесу – паляна, і там жа, побач з ёй, – малады дубоўнік* (І. Стадольнік).

Механізм сэнсавай спалучальнасці рэгулюе функцыянаванне разнавіднасцей поліпрэдыкатыўных адзінак з сінтаксічным падпарадкаваннем, гэта значыць з адносінамі аб'ектнымі, атрыбутыўнымі, акалічнаснымі і інш.: *Калі старшыня сказаў, што надзел пойдзе пад калгас, мы не адразу паверылі, што гэта ён нам* (І. Мележ). Аналагічным чынам рэгулюецца функцыянаванне самастойных сінтаксічных адзінак у структуры звышфразавага адзінства, заснаванае на прычынных, мэтавых, умоўна-выніковых і іншых адносінах: *А я думаў: прыйду з вайны, хату добрую пастаўлю. Каб першыя промні – у нашы вокны* (А. Дудараў). Адрозненні паміж часткамі складанага сказа і кампанентамі звышфразавага адзінства выяўляюцца ў характары аб'ектаў спалучэння. Пры немагчымасці рэгуляваць функцыянаванне з дапамогай семантыка-сінтаксічных адносін падключаюцца логіка-семантычныя, якія, у адрозненне ад сінтаксічных, падразумяваюць віды рэферэнтнай аднесенасці прэдыкатаў і аб'ектаў і змену іх лексіка-граматычнага класа і сінтаксічнай функцыі: *Глядзеў на вуліцу і бачыў: па Крывой праязджалі дзве фурманкі. Каля пярэдняй – селянін у зімовай салдацкай шапцы, у суконнай жакетцы, нізенькі. Другі – у адной картовай сарочцы* (С. Баранавых). Значыць, базавымі механізмамі рэгулявання іх функцыянавання будуць выступаць спалучэнне і ўзгадненне аднaчасова. Спалучэнне рэалізуецца ў абмежаванні лексем на месцы незамешчанай сінтаксічнай пазіцыі выказніка адносна лакатыва *каля пярэдняй* у дадзеным выпадку. Механізм узгаднення рэгулюе адсутнасць супярэчнасці паміж граматычна адрозным, але сэнсава падобным прэдыкату кампанентам-лакатывам.

***Фармальныя моўныя механізмы*** рэгулююць фармалізацыю сістэмы семантычных тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова – пабудову мадэлей і структурных схем у строгай адпаведнасці з тыпам прэдыката. Фармалізацыя адыгрывае важную ролю ў выяўленні семантычнай тыпалогіі канструкцый эліпсісам дзеяслова. Тыповы характар набываюць не сінтаксемы (як лічыць большасць даследчыкаў), а семантычныя кампаненты і мадэлі. Напрыклад, мадэль *данатар – прэдыкат – рэцыпіент – данатыў* указвае на семантыку актыўнага непераўтваральнага ўздзеяння, *агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш* – на семантыку руху. Фармалізацыя прадастаўляе зручны спосаб аналізу і класіфікацыі семантычных тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова на ўзроўні мадэлей без уліку канкрэтнага лексічнага напаўнення. Пабудова структурных схем дазваляе сістэматызаваць увесь арсенал структурна-сінтаксічных сродкаў, з дапамогай якіх рэалізуецца тая ці іншая мадэль. Фармалізацыя выступае адзіным магчымым спосабам выяўлення ступені частотнасці і прадуктыўнасці мадэлей.

***Сэнсавыя моўныя механізмы*** рэгулююць замяшчэнне эліпсаванага выказніка семантычна тоесным кампанентам (які і выступае ў якасці паказчыка), дзейнічаюць выключна на ўзроўні семантычнай мадэлі канструкцыі і абумоўлены законамі семантычнай спалучальнасці і семантычнага ўзгаднення. Якасны склад мадэлі рэгулюецца тыпам прэдыката і не дапускае «чужых» кампанентаў. Зрэдку назіраюцца выпадкі, калі кампанент выкарыстоўваецца ў некалькіх семантычных тыпах (напрыклад, пацыентыў у канструкцыях з семантыкай перамяшчэння і актыўнага дзеяння, спосаб у канструкцыях з семантыкай актыўнага дзеяння і руху і інш.). Аднак семантычна тоесны кампанент набывае тыпізаваны характар, напрыклад, паказчыкам семантыкі руху выступае адзін з лакатыўных кампанентаў (дырэктыў-фініш) або, пры яго адсутнасці, – медыятыў: *Я – у вёску* і *Я – пехатой.*

Сэнсавыя моўныя механізмы рэгулююць функцыянальны дыяпазон словаформ у парадыгме эліптычных сінтаксічных мадыфікацый з імпліцытнай семантыкай. Сутнасць падобнага рэгулявання заключаецца ў здольнасці кампанента набываць імпліцытную семантыку на аснове логіка-семантычнага ўзаемадзеяння. Сінкрэтычны характар словаформ (калі іх форма і функцыя не супадаюць) значна пашырае функцыянальны дыяпазон базавых канструкцый. Напрыклад, словаформа *пасадзіць (моркву)* можа набываць функцыю інфінітыва: *Маці пайшла павярнуць сена. Я – **пасадзіць** моркву* і тэмпаратыва (імпл.): *– Ты – надоўга? – Толькі **пасадзіць** моркву і назад,* другая з якіх кваліфікуецца як імпліцытная.

***Актуалізацыйныя моўныя механізмы*** рэгулююць эксплікацыю сінтаксічных значэнняў тэмпаральнасці, мадальнасці і персанальнасці ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова. Прэдыкатыўныя катэгорыі кваліфікаваліся як паняційныя (Г.А. Золатава), ацэначныя (Л.І. Бурак), семантыка-граматычныя (Т.Р. Рамза). Аднак адсутнасць базавага сродку выражэння названых значэнняў дае падставы нам кваліфікаваць іх як актуалізацыйныя ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова. Эксплікацыя значэнняў тэмпаральнасці, мадальнасці і персанальнасці абумоўлена сінтаксічнымі (сінтаксічны паралелізм і сінтаксічныя адносіны), структурнымі (наяўнасць дэтэрмінаванага члена сказа), лексічнымі (лексічны спосаб выражэння тэмпаральнасці і персанальнасці) і фанетычнымі (інтанацыя) фактарамі. Адметнасць актуалізацыйных моўных механізмаў заключаецца ў здольнасці іх выкарыстоўваць рознаўзроўневыя моўныя адзінкі

ў якасці функцыянальнага эквіваленту базаваму сродку – дзеяслову і аб’яднаць іх у сістэму кампенсаторных сродкаў на аснове адпаведных параметраў.

***Інтэрпрэтацыйныя моўныя механізмы*** рэгулююць спосабам эліпсавання іерархічную арганізацыю камунікатыўна значных кампанентаў і сінанімічныя пераўтварэнні сінтаксічнай адзінкі. Яны вызначаюць функцыянальны дыяпазон словаформ у парадыгме эліптычных сінтаксічных мадыфікацый з катэгарыяльнымі зменамі і сінанімічнымі пераўтварэннямі кампанента. Семантычная функцыя словаформы інтэрпрэтуецца ў адпаведнасці з кантэкстуальнымі фактарамі (катэгарыяльныя змены) або трансфармацыйнай парадыгмай (сінанімічныя пераўтварэнні).

**Заключэнне.** Сістэма моўных механізмаў адлюстроўвае заканамернасці, што рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Кампенсацыя эліпсіса, што ажыццяўляецца з дапамогай моўных сродкаў розных узроўняў – сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага, можа быць абумоўлена логіка-семантычнымі і семантыка-сінтаксічнымі фактарамі.

Аналіз паказаў, што моўныя механізмы рэгулююць кампенсаторную функцыю частак у структуры поліпрэдыкатыўных сінтаксічных адзінак з эліпсісам дзеяслова:

• экспліцытна-паратаксічнага, імпліцытна-паратаксічнага, экспліцытна-гіпатаксічнага, імпліцытна-гіпатаксічнага, камбінаванага відаў;

• замяшчэнне эліпсаванага выказніка функцыянальна тоесным кампанентам, які выступае ў якасці паказчыка семантыкі ў канструкцыях наступных семантычных тыпаў: дынамічна-лакатыўнага, экзістэнцыяльна-лакатыўнага, лакатыўна-пацыентыўнага, акцыянальна-безаб’ектнага, акцыянальна-дэлібератыўнага, акцыянальна-аб’ектнага пераўтваральнага, акцыянальна-аб’ектнага непераўтваральнага, экзістэнцыяльна-тэмпаральнага, статальнага, рэляцыйнага;

• структураванне семантычных тыпаў эліптычных канструкцый у адпаведныя мадэлі і схемы.

## Літаратура


1. Harma, J. Sur l'omission du verbe et sa recuperabilité en français / J. Harma // Actes du 9e Congrès des romanistes scandinaves, Helsinki, 13–17 aout 1984. – Helsinki, 1986. – P. 135–146.
2. Wiśniewski, M. Przegląd równoważników zdania znamiennych dla współczesnej polszczyzny / M. Wiśniewski // Acta Univ. Nicolai Copernici. Nauki Humanistyczno-społecz. Filologia Polska. – Toruń, 1995. – T. 46. – S. 115–150.
3. Мухин, А.М. Структура предложений и их модели / А.М. Мухин. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние, 1968. – 230 с.
4. Шабанова, Т.Д. Предложение и его лимитативные модели: учеб. пособие к спецкурсу / Т.Д. Шабанова. – М.: Моск. гос. пед. ин-т, 1985. – 82 с.
5. Carlson, K. Paralelism and prosody in the processing of ellipsis sentences / K. Carlson. – New York; London: Routledge, 2002. – 227 p.
6. Грудева, Е.В. Избыточность текста, редукция и эллипсис: (на материале русского языка): автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.19 / Е.В. Грудева; С.-Петерб. гос. ун-т. – СПб., 2008. – 40 с.
7. Лекант, П.А. К проблеме неполных предложений в русском языке / П.А. Лекант // Учен. зап. / Моск. обл. пед. ин-т. – М., 1963. – Т. 139, вып. 9: Русский язык и литература. – С. 43–49.
8. Золотова, Г.А. Коммуникативные аспекты русского синтаксиса / Г.А. Золотова. – М.: Наука, 1982. – 368 с.
9. Колосова, Т.А. Русские сложные предложения асимметричной структуры / Т.А. Колосова. – Воронеж: Изд-во Воронеж. ун-та, 1980. – 164 с.
10. Лисоченко, Л.В. Высказывания с имплицитной семантикой: логич., язык. и прагмат. аспекты / Л.В. Лисоченко; отв. ред. Г.Ф. Гаврилова; Сев.-Кавказск. науч. центр высш. шк. – Ростов н/Д: Изд-во Рост. ун-та, 1992. – 152 с.
11. Дикарева, С.С. Системная обусловленность имплицитных смыслов текста / С.С. Дикарева // Исследования по семантике: сб. науч. ст. / Симфероп. гос. ун-т; редкол.: О.М. Соколов (отв. ред.) [и др.]. – Симферополь, 1987. – С. 84–90.
12. Hausperger, B. Schprachökonomie in Grammatik und Pragmatik: die Ellipse / B. Hausperger. – München: Utz, 2003. – IX, 327 s.


*Паступіў у рэдакцыю 13.11.2023*